**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за люты 2022 г.

У лютым ў публічных бібліятэках ДУК былі праведзены разнастайныя мерапрыемствы **да Тыдня роднай мовы**: літаратурна-паэтычныя гадзіны, урокі беларусазнаўства, выступленні літаратурна-паэтычных груп, Дні роднай мовы. 21 лютага у бібліятэках сістэмы прайшла акцыя «Размаўляй са мнйо па-беларуску».

**У рамках Года гістарычнай памяці** прайшлі мерапрыемствы да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дня абаронцаў Айчыны: Дні інфармацыі «Афганистан: героизм и трагедия XX века», патрыятычныя гадзіны «Не ради славы и наград», вечары памяці, вечара сустрэч «Кобринчане – Герои Афганской войны», урокі гістарычнай памяці «Время выбрало нас», урокі мужнасці «Как это было…», літаратурна-музычныя кампазіцыі «Отвага, Родина и честь».

## <u>Мерапрыемствы да Тыдня роднай мовы</u>

**19 лютага**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо» прайшло ў анлайн-рэжыме. З вуснаў кобрынскіх паэтаў гучала шмат твораў, напісаных па-беларуску. Удзельнікі пасяджэння прыгадалі славутага беларускага байкапісца Кандрата Крапіву і іншых аўтараў, якія ў сваёй творчасці звярталіся да гэтага літаратурнага жанру. А падчас правядзення літаратурнай лабараторыі «Пішам байку», яны знаёміліся з тэорыяй напісання баек і вучыліся падбіраць рыфмы з markознымі часцінамі мовы.

ЦБ, 17 чал.

**21 лютага**

Бібліятэка правяла свята кнігі «Мовы пяшчотнай сузор'е». На свята прыйшлі настаўнікі і вучні Тэвельскага дзіцячага сада-пачатковай школы. Бібліятэкар разам з вучнямі правяла гульні і конкурсы: «Паэтычны», «Загадкавы», «Гарады Беларусі», «Моўны скарб». Пад дэвізам «Спяваем і танчым сваё беларускае!» вучні пад баян спявалі беларускія песні «Дударык», «Кацілася чорна галка», «Грэчанікі», танчылі беларускія народныя танцы «Бульба», «Лявоніха», «Ручаёк», якія з задавальненнем прапанавала загадчыца клуба Марчук Алена Мікалаеўна. Прысутных зацікавіла кніжная выстава «Душа народа ў творах іх жыве», прысвечаная 140-годдзю з дня нараджэння знакамітых песняроў беларускага народа Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Тэвельская ПБ, 35 чал.

**22 лютага**

Падчас правядзення пасяджэння аматарскага клуба «Светоч» адбылася літаратурная гадзіна «Крыніцай звіняць твае словы, мая беларуская мова». Кіраўнік клуба Астаповіч Л. І. вяла гутарку аб роднай мове «Любі, шануй, ведай роднае слова». Вучні 6 класа СШ №1 удзельнічалі ў конкурсах: «Канструяванне слоў», «Аматары беларускага фальклору», «Пазнай фразеалагізм!» Хлопчыкі і дзяўчынкі чыталі вершы пра Радзіму і родную мову.

Дзіцячы філіял, 21 чал.

## Мерапрыемствы да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, Дня абаронцаў Айчыны

**11, 12, 15 лютага**

Супрацоўнікі бібліятэкі запрасілі навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа на цыкл гістарычнага дасье «Память возвращает нас в Афганистан». Юнакі праслухалі рассказ аб прычынах уводу савецкіх войскаў у Афганістан, аб мужнасці і адвазе савецкіх воінаў, аб цяжкіх умовах, у якіх даводзілася ваяваць, пра беларускіх воінаў-інтэрнацыяналістаў. Да мерапрыемства падрыхтавана выстава-панарама «К подвигу героев сердцем прикоснись» і відэаролік «Листая страницы Афганской войны».

ЦРБ, 78 чал.

**17 лютага**

Біблятэка правяла вечар памяці «Рубцом на сердце лёг Афган». Вядучыя расказалі гасцям пра мужнасць і гераічнасць салдатаў, якія прымалі ўдзел у ваенных падзеях у Афганістане, пазнаёмілі з тэматычнай выставай «Из пламени Афганистана». Старшыня сельскага Савета павіншавала воінаў-інтэрнацыяналістаў (7 члавек) і ўручыла ім памятныя падарункі. Мерапрыемства суправаджалася паказам слайд-прэзентацыі «Афганистан… дни, ушедшие в вечность».

Дзівінскі філіял, 45 чал.

**23 лютага**

Вакальная група «Фантазия» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі правяла музычна-паэтычны вечар «Мы видим в вас героев славных». Гучнымі апладысментамі і словамі падзякі сустрэлі мужчыны Брэсцкай абласной арганізацыі БОО «БелТІЗ» песенныя і паэтычныя віншаванні бібліятэкараў. Сямейны дуэт Пятра Нікіцюка і Анастасіі Машоннік пацешыў гледачоў кампазіцыямі, выкананымі пад акампанемент баяна. Прадстаўнік арганізацыі Смяховіч Валянціна Мікалаеўна звярнулася да прысутных са словамі добрых пажаданняў і ўручыла памятныя падарункі.

ЦРБ, 24 чал.

**23 лютага**

У бібліятэцы прайшла інтэлектуальная гульня «Армейский экспресс». Бібліятэкар расказала школьнікам, чаму менавіта 23 лютага мы віншуем усіх

тых, хто ахоўвае супакой нашай краіны. Школьнікі з цікавасцю слухалі аповед пра выдатных военачальнікаў, знаёміліся з патрыятычнай прозай вядомых пісьменнікаў, пра гістарычныя і ваенныя падзеі. Потым дзеці з ўдзельнічалі ў конкурсах «Пароль», «Военная подготовка», «Выдающихся людей надо знать в лицо». Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй «Наша Армия сильна!»

Гарадзецкая ПБ, 18 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**4 лютага**

У рамках рэспубліканскай акцыі «Безопасность в каждый дом!» супрацоўнікі бібліятэкі запрасілі працаўнікоў Кобрынскага раённага аддзела па НС для правядзення пазнавальнай гадзіны «Страшная стихия – огонь». Працаўнікі службы выратавання растлумачылі прысутным асноўныя правілы бяспекі, расказалі, як паводзіць сябе, каб пазбегнуць небяспечных сітуацый, а таксама правялі прэзентацыю мабільнага дадатку «МЧС Беларуси: Помощь рядом». Падчас мерапрыемства арганізавана работа інтэрактыўных пляцовак: «Безопасная эвакуация», «Правила поведения в толпе», «Эвакуационные знаки», «Опасная печь», «Первичные средства пожаротушения». Удзельнікі разгадвалі загадкі, расшыфроўвалі словы, адказвалі на пытанні міні-віктарыны.

Дзівінскі філіял, 36 чал.

**11лютага**

У сацыяльнай сетцы Ютуб размешчаны «Фотокалейдоскоп бібліятэчных мерапрыемстваў «Библиоовации» з удзелам вакальнай групы «Фантазия».

*Кондрашук, Н. Когда поют библиотекари / Н. Кондрашук // Кобрин-информ. – 2022. – 10 февраля. - С. 15.*

ЦРБ

**14 лютага**

Гасцямі чарговага пасяджэння клуба «Каласок» публічнай бібліятэкі сталі вышывальшчыца Гамола Мая Іванаўна, каравайшчыца Слабада Валянціна Фёдараўна і носьбіт традыцыйнай нацыянальнай культуры Марчук Алена Мікалаеўна. Майстар-клас па вышыўцы крыжам і вырабу махроў правяла Мая Іванаўна. Пра прызначэнне і выгляды ручнікоў расказала Алена Мікалаеўна. Каравайшчыца Валянціна Фёдараўна падзялілася рэцэптамі вясельных караваяў. Скончылася мерапрыемства салодкім пачастункам і гульнямі.

Тэвельская, 22 чал.

**18 лютага**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылося метадзгуртаванне школьных бібліятэкараў горада і раёна, якое прайшло ў форме семінара-практыкуму «Расширение информационно-образовательного пространства библиотек посредством взаимодействия учреждений образования и

культуры: опыт и перспективы». Спецыялісты цэнтральнай раённай бібліятэкі прадставілі краязнаўчыя рэсурсы ўласнай генерацыі, далі метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы ў Год гістарычнай памяці, пазнаёмілі з электроннай базай па афармленню бібліятэк. З пытаннямі работы школьных бібліятэк выступілі метадыст Дзяржаўнай навучальна-метадычнай установы «Кобринский районный учебно-методический кабинет» Ё. А. Байдалова і кіраўнік метадзгуртавання школьных бібліятэкараў І. Н. Трацюк.

ЦРБ, 24 чал.

**18 лютага**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу і нядзельнай школай правяла духоўна-асветніцкія чытанні «Мир без сквернословия» для моладзі. Маладыя людзі выказвалі свае адносіны да праблемы, разважалі пра прычыны яе ўзнікнення і шляхі развязку, дэманстравалі адлюстраванне тэмы ў паэзіі. Арганізавана выстава «Чистота слова - чистота души». Прысутныя праслухалі выступленне святара Петрапаўлаўскай царквы - айца Уладзіміра. Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй.

Залеская ПБ, 55 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

**20 студзеня**

Бібліёграфы цэнтральнай раённай бібліятэкі прапануюць азнаёміцца з Календаром прававых і грамадска-палітычных дат, распрацаваным у рамках ПЦПІ Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Каляндар змяшчае гісторыю святаў, цікавыя факты, інфармацыю пра памятныя даты ў гісторыі дзяржавы і права, штогадовых міжнародных паказальных і памятных датах, пра юбілеі заканадаўчых актаў.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81